«Прямая линия» с врачом-офтальмологом высшей категории медицинского центра «ЛОДЭ» Ириной ХАРЛАНОВИЧ – на 7-й стр.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадо...
Якуб КОЛАС

№ 41 (4396)

28 мая 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

РАКУРС

Смерть белоруса в трудоспособном возрасте – это 100–150 тысяч долларов недополученной государством прибыли

В прошлом году, согласно данным Белстата, в Беларуси умерли 120.053 человека. Для сравнения: это больше населения Орши – одного из восьми городов-стотысячников страны. То, что люди умирают, закономерно, беспокоит другое – не уменьшается смертность белорусов трудоспособного возраста. Например, в 2017 году в трудоспособном возрасте умерли 3807 женщин и 17.394 мужчины. Медики говорят, что во многом это зависит от нашего безразличного отношения к собственному здоровью, также в эту статистику «вносят» свою лепту несчастные случаи, ДТП, отравления алкоголем.

Недавно на данную проблему медики посмотрели с другого ракурса. Председатель Белорусской ассоциации врачей, депутат Палаты представителей, в прошлом главврач 34-й минской поликлиники Дмитрий Шевцов заявил: *«Мы не считаем экономический ущерб, который наносит государству смерть человека, находящегося в трудоспособном возрасте. В год вклад в ВВП человека в трудоспособном возрасте составляет около 10.000 долларов США. Если он умирает в раннем трудоспособном возрасте, не доживает до пенсии 10–15 лет, то недополученная государством прибыль составляет 100–150 тысяч долларов США. Прямые ожидаемые экономические потери от смертности населения в трудоспособном возрасте составляют миллионы долларов. Государство с этой точки зрения имеет законное право предъявлять претензии тем пациентам, которые не сохраняют свое здоровье».*

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

РЭГІСТРАТУРА

Мінус 3400 урачоў

На столькі ў мінулым годзе зменшылася колькасць практыкуючых урачоў у Беларусі.

Памятаеце, у 2006 годзе тагачасны міністр аховы здароўя **Васілій Жарко** абвясціў кампанію па павелічэнні набору ў медыцынскія ВНУ краіны і паабяцаў да 2013 года вырашыць праблему недахопу медыцынскіх кадраў з вышэйшай адукацыяй і нарэшце пакончыць з кадравым дэфіцытам у медыцыне.

Але аказалася, што гэтыя планы не толькі не атрымалася рэалізаваць, сёння ўрачы – адны з самых запатрабаваных спецыялістаў на рынку працы Беларусі. А ў мінулым годзе, паводле звестак Белстата, колькасць практыкуючых урачоў у параўнанні з 2017 годам скарацілася на 3,4 тысячы.

Колькасць практыкуючых урачоў (тыс. чалавек):
2016 год – 41,5,
2017-й – 42,0,
2018-й – 38,6.

У Міністэрстве аховы здароўя ўжо не ўтойваюць, што затрымліваць урачоў у прафесіі становіцца ўсё больш складана, і ў сувязі з гэтым абяцаюць даплаты асобным катэгорыям медработнікаў. На сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні пры Савеце Рэспублікі і Савета Акадэміі кіравання пры прэзідэнце намеснік міністра аховы здароўя **Вячаслаў Шыла** казаў, што *"гэта будуць запатрабаваныя хірургі і тыя, хто бярэ ўдзел у вузкаспецыялізаваных аперацыях. Пералік будзе дапрацоўвацца»*. Таксама Вячаслаў Шыла распавёў, што *«ў апошні час расце колькасць зваротаў у Міністэрства аховы здароўя за пацвярджэннем дыпломаў для выезду і ажыццяўлення дзейнасці за мяжой". "Такія дакументы ў нас запытваюць каля 200 чалавек у год на розных падставах,* – адзначыў прадстаўнік міністэрства. – *Нашы ўрачы вельмі запатрабаваныя за мяжой, у прыватнасці ў Польшчы, краінах Балтыі, Германіі, а таксама на Блізкім Усходзе. Яны прыцягваюцца і для працы на Украіне ў спецыялізаваных цэнтрах».*

Дарэчы, таксама сумна выглядае кадравая сітуацыя і з медыцынскімі сёстрамі. Летась у параўнанні з 2017 годам іх колькасць у дзяржаўных установах аховы здароўя зменшылася больш як на 11 тысяч!

Колькасць сярэдніх медыцынскіх работнікаў, паводле дадзеных Белстата:
2016 год – 125,8 тысячы чалавек,
2017-й – 126,3,
2018-й – 115 тысяч чалавек.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

АНОНС

Лісты з Палесся

Беларускае Палессе здаўна прыцягвала да сябе ўвагу. Сюды з усяго свету ехалі этнографы і фалькларысты, гаспадарнікі і абшарнікі, мастакі і аматары нечапанай прыроды. Надзейна адгароджанае ад цывілізацыі паўнаводнай Прыпяццю, Палессе захавала і даўнія традыцыі, і песенную аўтэнтыку, і своеасаблівы паляшуцкі гумар. Скажам, яшчэ 150 гадоў таму даследчык Чэслаў Пяткевіч запісаў у палескай глыбінцы незвычайны тост. Калі палешуку хацелася выпіць, а не было з кім, ён знаходзіла размаўляў з налітай чаркай: "Хто ты будзеш? – Акавіта. / – А з чаго ты будзеш? – З жыта. / – А пашпарт у цябе ёсць? – Няма. / – Раз няма, табе – турма!" І са смакам выпіваў.

Выбіраючыся ў вандроўку на Палессе, я без лішніх роздумаў выбраў Столінскі раён. Па-першае, ён самы вялікі ў краіне па плошчы. Па-другое, менавіта на Століншчыне знаходзіцца самая вялікая ў Беларусі вёска. Па-трэцяе, Столінскі раён мяжуе з Украінай, што па-свойму ўплывае на яго развіццё. Я мог бы і далей пералічваць: па-чацвёртае, па-пятае, па-шостае... Але лепш адзін раз пабачыць на свае вочы, чым дзесяць разоў прачытаць у Вікіпедыі. То – запрашаю на Століншчыну, падарожжа па якой мы пачнём з той самай найвялікшай вёскі Альшаны. А ў наступных нумарах вас чакае серыя эксклюзіўных матэрыялаў са старажытнага Давыд-Гарадка, загадкавага Рубля, славутай сваімі ганчарамі Гарадной, памежнага Церабяжова...

Міхась СКОБЛА.

Пачатак серыі – на 3-й стар.

КРИМИНАЛ

СК: раскрыто убийство бизнесмена в Березино, исполнитель – бывший сотрудник спецподразделения

В суд передано уголовное дело об убийстве 41-летнего бизнесмена из Березино Сергея Метельского. Преступление было совершено осенью 2016-го, и поначалу дело казалось «висяком». Только спустя несколько лет у следствия появились обвиняемые, и главный фигурант – экс-сотрудник одного из спецподразделений Беларуси. Об этом заявили представители СК и МВД на брифинге.

В СК рассказали детали расследования убийства Сергея Метельского – бизнесмена из Березино и бывшего работника финансовой милиции.

В день убийства, 26 сентября 2016 года, бизнесмен, как обычно, примерно в 9 часов утра на своей машине выехал из дома по делам в Минск. Возле дома, по данным следствия, к нему в авто сел преступник, а за городом на развилке дорог выстрелил бизнесмену в голову и поджег машину.

Дерзкое преступление и прошлое бизнесмена

«Преступник действовал хладнокровно, расчетливо и дерзко (час пик, активное движение транспорта) – все это позволяло сделать вывод о смелости преступника и наличии у него определенных профессиональных навыков», – говорит первый заместитель начальника Главного следственного управления СК Василий Галь.

На это указывал и тот факт, что когда рядом с горящей машиной остановился проезжавший мимо сотрудник МЧС, то преступник не сбежал, а выстрелом спугнул очевидца. После чего вернулся к машине и усилил огонь, в результате машина сгорела почти полностью.

«Следов на месте преступления, по которым можно было отыскать преступника, не обнаружили. Это обстоятельство наложило отпечаток на сроки расследования и установления личности преступника», – добавил Галь.

Эксперты собрали антропометрические данные преступника: мужчина возрастом около 40 лет, рост примерно 170 см, спортивного телосложения, в хорошей физической форме. К делу привлекли коллег из России, которым после работы с очевидцами преступления удалось «активизировать их память и составить субъективный портрет преступника».

У следствия было несколько версий случившегося: убийство Метельского должниками, спонтанное убийство (так как бизнесмен периодически возил с собой крупные суммы) или в связи с его работой и коммерческой деятельностью. А также убийство мужчины кем-то из его окружения – из-за мести, ревности и так далее.

Правоохранители отрабатывали круг общения Метельского (порядка 700 человек) и все события до убийства в 2016-м. Выяснилось, что в 2011 году расходы бизнесмена значительно превысили официальные источники дохода: он покупал недвижимость, давал взаймы крупные суммы – даже 100 тысяч долларов.

«Особенность заключалась в том, что при этом Метельский не составлял документы, все оформлялось на доверительной основе или на подставных лиц», – говорит представитель ГСУ СК. Но в Беларуси у бизнесмена не нашли контрагентов, которые могли быть источником такого обогащения.

Связь с другим делом. Один фигурант – бывший сотрудник спецподразделения

А вот в России нашли ряд фирм и организаций, с которыми сотрудничал Метельский – и не только он, но также Андрей Косяк, менеджер из Минска, которого убили спустя полтора месяца после бизнесмена в Березино. Выяснилось также, откуда у Метельского появились большие суммы: на вторичном рынке жилья он покупал и оформлял на третьих лиц квартиры и дома.

Когда у следствия появилось связующее звено – убийство менеджера Косяка, – к делу подключился ГУБОПиК МВД. Ведь к тому моменту по делу об убийстве менеджера были обвиняемые.

(Окончание на 2-й стр.)

НУ И НУ!

Бежал из больницы за... смертью

Гомельский городской отдел СК проводит проверку по факту гибели пациента Гомельской областной туберкулезной клинической больницы.

Известно, что 26 мая мужчина 1956 года рождения, находящийся на лечении, пытался покинуть учреждение. Для этого он связал простыни и через окно хотел спуститься с четвертого этажа на улицу. Однако в какой-то момент сорвался вниз и разбился.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

Зрабіце падарунак бацькам...

Ведаем: у таго, хто жыве ў горадзе, няма праблемы з набыццём "Народнай Волі". Хочаш – афармляй падпіску ў бліжэйшым паштовым аддзяленні, а хочаш – набывай газету ў шапіках, якіх нямала.

А вось як быць Вашым бацькам, сябрам, якія па волі лёсу жывуць у вёсках, дзе няма ні паштовых аддзяленняў, ні шапікаў? Стаць чытачамі "Народнай Волі" яны могуць пры вашай дапамозе. Зрабіце, калі ласка, ім падарунак – падпішыце на адрас іх пражывання "Народную Волю", і яны выкажуць вам сваю ўдзячнасць.

Поўным ходам ідзе падпіска на другое паўгоддзе. І Вы маеце магчымасць парадаваць сваіх бацькоў, сваякоў, якія жывуць у правінцыі і якія хацелі б рэгулярна атрымліваць цікавую інфармацыю са старонак "Народнай Волі".

Адгукніцеся, шаноўныя сябры!
Наша сіла – у згуртаванасці!

Рэдакцыя.

СТОП-КРАН

Генадзя Фядыніча не пускаюць на лецішча да цешчы

Крымінальна-выканаўчая інспекцыя Цэнтральнага РУУС Мінска ўстанавіла новыя нормы паводзін для асуджанага на 4 гады абмежавання волі лідара прафсаюза РЭП Генадзя Фядыніча. Цяпер ён не павінен пакідаць кватэру з 21.00 да 6.00.

Паводле слоў суразмоўцы "Народнай Волі", ён таксама звяртаўся ў міліцыю, каб далі дазвол хаця б раз на месяц з'ездзіць у выхадныя дні на лецішча і дапамагчы цешчы, але пакуль дазвол не даюць.

"Цешча засталася без дапамогі", – з сумам дадае прафсаюзны лідар.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 МАЯ 2019 г.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Александр ФЕДУТА

Не бойтесь своих чувств!

В воскресенье 26 мая в Республиканском дворце профсоюзов состоялся необычный спектакль «Восемь чувств». На сцене играли дети и взрослые. Играли, в большинстве случаев непрофессионально. Но спектакль у них получился добрый и мудрый. О том, как ребенок учится чувствовать. Учится понимать, что такое страх и что такое обида, что такое радость и что такое любовь. Актерам, среди которых были и совсем невзрослые, удалось рассказать об этом залу. И после окончания спектакля они получили совершенно заслуженные аплодисменты.

Собравшиеся присутствовали на очередном спектакле благотворительного фонда «Семейный инклюзив-театр і», а на сцене большинство детей были из числа тех, кого называют аутистами. И спектакль был для них формой преодоления самих себя, потому что аутизм –генетическая модификация, которая мешает нормальному процессу общения с другими людьми. И публичный разговор о чувствах – это процесс обучения этим чувствам, процесс развития чувств. То, что позволит родителям, ощущающим собственную смертность достаточно остро, хотя бы немного облегчить социализацию, вписанность в общество своих детей, когда те останутся совсем одни.

Вероятно, все, кто пришел в этот зрительный зал, понимали главное: многим из этих детей-актеров все еще тяжело сказать даже одну фразу. А здесь, на сцене, они произносят монологи. Во дворе они могут бояться говорить и играть с другими детьми – но здесь они свободно жестикулируют, играя роли – пусть маленькие роли, но ведь даже маленькая роль требует владения собой, сосредоточенности, умения преодолеть страх.

Я не был ребенком-аутистом. Но я стеснялся собственного толстого тела. Я боялся того, что картавил. Мне мешали очки, постоянно, с третьего класса, сидевшие на моем носу. Это было страшно – чувствовать, что ты не такой. И я тоже пошел в театральную студию. И я выходил на сцену. Как потом помогло мне, уже школьному учителю, что когда-то мои театральные режиссеры Ольга Алексеевна Филипчик, Александр Петрович Струнин, Константин Евгеньевич Алехин научили меня преодолевать свой страх. Тогда, в семидесятые годы прошлого века, театральные студии и другие кружки были бесплатными, и ребенок из любой семьи мог себе позволить выбирать то, что позволяло ему проявить себя.

Сейчас время изменилось, и не во всем оно изменилось к лучшему. Но дети остаются детьми. О них нужно заботиться. Обо всех. Особенно об их взрослении. Есть ведь аутисты, а есть просто больные дети, например больные синдромом Дауна. Раньше, когда работы хватало для всех, они, став взрослыми, могли трудоустроиться хотя бы на низкооплачиваемую и не самую квалифицированную – но работу. И работники из них получались неплохие, добросовестные. Я знаю об этом, мне рассказывали. Но сейчас ведь реальная безработица значительно выше, чем официальные показатели. Куда деваться им после того, как их родители умрут или просто не смогут их содержать? Ведь дети не виновны в том, что они родились «солнечными», а общество не всегда помогает им выжить. Общество становится все более жестоким.

Жестоким по отношению ко всем. К тем, кого называют сегодня людьми с ограниченными возможностями. Вы уверены, например, что наши колясочники смогут нормально обучаться в университете, в котором не предусмотрен лифт – даже если он или она гениальны и из них может получиться лучший в мире программист? Сентиментальный до слез роман Владимира Короленко о слепом музыканте все вы наверняка помните – а сможет ли сегодня слепой концертировать в главных залах белорусской столицы, есть ли у него возможность получить соответствующее образование и играть серьезную музыку?

Не бойтесь своих чувств, взрослые! Не бойтесь показаться излишне добрыми и мягкими – просто потому, что добро не бывает излишним. Раз в месяц потратьте два часа времени, чтобы посмотреть этот спектакль. Он покажется вам страшно наивным. Ну как же: Страх, Обида, Радость, Интерес – разве они могут быть героями пьесы? Разве это интересно?

Отвечу вопросом на вопрос: а Душа Хлеба, Душа Огня, Душа Молока, Ночь, Свет – они могут быть героями? Могут! Это герои «Синей Птицы» Мориса Метерлинка, которая до сих пор не сходит с мировых сцен. Синяя Птица стала символом достигаемой мечты. Помогите детям реализовать их мечту. Поддержите их хотя бы аплодисментами.

ВІНШУЕМ!

Аляксандр ТРЫПУЦЬ:

«Першы раз выступаў у такі моцны дождж…»

Беларускі паралімпіец працягвае радаваць сваімі вынікамі.

У мінулыя выхадныя кідальнік кап'я **Аляксандр Трыпуць** перамог на турніры Гран-Пры ў Швейцарыі.

– Гэтыя спаборніцтвы былі адборачнымі да Паралімпіяды-2020, – распавёў пераможца «Народнай Волі». – І ў пэўным сэнсе сталі выпрабаваннем, бо я першы раз кідаў кап'ё ў такі моцны дождж. Таму і вынік быў не самы лепшы.

– Як арганізацыя турніру?

– На самым высокім узроўні. Было шмат удзельнікаў з розных краін, але абсалютна ніякіх нараканняў да арганізатараў. Швейцарыя – вельмі прыгожая краіна, але, на жаль, не было часу пазнаёміцца з ёй больш дасканала. У суботу праходзілі спаборніцтвы, а ўжо ў нядзелю трэба было вяртацца дадому.

– Якія далейшыя планы?

– 8–9 чэрвеня прыму ўдзел у Гран-пры Італіі, а напрыканцы наступнага месяца пройдуць спаборніцтвы ў Тунісе. Хаця галоўныя старты года для мяне будуць у лістападзе, калі адбудзецца чэмпіянат свету.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СІТУАЦЫЯ

Як актывіст на пасяджэнне выканкама не патрапіў

Гродзенец **Анатоль Мышкевіч** дзейсны і актыўны грамадзянін. Летась «Народная Воля» пісала аб тым, як ён хацеў наладзіць відэатрансляцыю з пасяджэнняў Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў. Улады яго ініцыятыву не падтрымалі, спаслаўшыся на тое, што, маўляў, усе дакументы і нарматыўныя акты, прынятыя гарвыканкамам і гарадскім Саветам дэпутатаў, асвятляюцца ў СМІ і ў банку дадзеных прававой інфармацыі. Тады актывіст дайшоў да суда з чыноўнікамі, але разгляд справы быў прыпынены з прычыны парушэння тэрміну падачы заявы.

На мінулым тыдні Мышкевіч задаўся мэтай папрысутнічаць на пасяджэнні гродзенскага выканкама, дзе чыноўнікі падводзілі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця горада за першы квартал гэтага года.

«Я хацеў паглядзець і паслухаць, як працуюць нашы чыноўнікі, – расказвае актывіст. – *Заробкі ў нашым горадзе нізкія, людзі жывуць цяжка, многія з'язджаюць з краіны ў пошуках лепшай долі. І мне хацелася не толькі самому пабачыць іх працу, задаць ім пытанні, але потым праз сацыяльныя сеткі распавесці пра гэта іншым падаткаплацельшчыкам».*

Мышкевіч кажа, што гэтым разам папярэдне схадзіў у гарвыканкам і пракансультаваўся ў кіраўніка спраў **Віталя Мамачкіна** (ён курыруе пытанні дакументацыйнага забеспячэння дзейнасці гарвыканкама), якім чынам можна патрапіць на пасяджэнне выканкама.

«Мамачкін мне патлумачыў, што я не павінен пісаць нейкіх адмысловых заяў, а прыйсці перад пачаткам пасяджэння і звярнуцца з просьбай да старшыні. Калі той дасць сваю згоду, то я магу свабодна прысутнічаць», – згадвае Мышкевіч.

Так ён і зрабіў. Прыйшоў раніцай перад пасяджэннем выканкама і, што цікава, перад кабінетам, дзе павінна была адбыцца нарада, убачыў таго самага Мамачкіна.

«Ён мне адразу заявіў, што на пасяджэнне мяне не пусціць, – гаворыць Мышкевіч. – *Пачаў казаць, што трэба пісаць адмысловую заяўку: маўляў, такія правілы, выбачайце».*

Далейшай размовы з Мамачкіным, паводле слоў актывіста, не атрымалася.

«Народнай Волі» Мамачкін таксама адказаў коратка і знаёмай фразай: *«Пішыце афіцыйны запыт, мы па тэлефоне інфармацыі не даём».*

Анатоль Мышкевіч лічыць, што гродзенскія ўлады сталі нейкай закрытай структурай, куды звычайны падаткаплацельшчык не можа патрапіць, асабліва калі нехта не жадае там яго бачыць.

«Публічна ўлады заяўляюць, што яны адкрытыя для свайго народа, што ім няма чаго ўтойваць. Дык чаму тады яны не пускаюць звычайных людзей на пасяджэнні, дзе вырашаецца лёс горада і яго жыхароў?» – задаецца пытаннем Мышкевіч. Ён кажа, што на гэтым не спыніцца і працягне дамагацца магчымасці прысутнічаць на пасяджэннях выканкама і гарадскога Савета.

Міхал КАРНЕВІЧ.

КРИМИНАЛ

СК: раскрыто убийство бизнесмена в Березино, исполнитель – бывший сотрудник спецподразделения

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

«Фигуранты (*Алексей Синькевич и Ростислав Светчиков*) к тому моменту больше года находились в СИЗО, все методы и формы оперативно-розыскной деятельности им были известны, что осложняло расследование. С учетом этого нами все равно была проведена не одна оперативная комбинация, тактические ходы и оперативная хитрость – и в октябре 2018-го Синькевич написал явку с повинной, где указал об известных ему обстоятельствах убийства Метельского, а именно: якобы именно Светчиков попросил его совершить убийство Метельского и даже назвал сумму (*заказа*) в 30 тысяч долларов», – рассказал замначальника ГУБОПиК МВД Владимир Тихиня.

Второй фигурант, сам Светчиков, молчал. Но характеристика на Синькевича, говорят оперативники, не позволяла «до конца ему поверить». Более того, в его явке имелись детали, которые мог знать только убийца. И через какое-то время заговорил Светчиков:

«Указал, что подвозил Синькевича к месту убийства не однажды. И (*в том числе к месту убийства*) Метельского, вымогали долг около 500 тысяч долларов, и другие обстоятельства», – говорит Тихиня.

Следствие пришло к выводу, что именно Синькевич и был убийцей, а явкой и указанием на знакомого хотел спасти самого себя. Выступающие сослались на характеристику Синькевича: дерзкий, в конфликтных ситуациях склонен к взвинчиванию, стремится к лидерству.

«Служил не один десяток лет в спецподразделении РБ, подготовлен, умеет обращаться с оружием», – перечисляет Тихиня. А вот Светчиков, которого первым обвинили в убийстве, перебивался подработками, занимался спортом и последнее время работал водителем того самого менеджера Косяка.

Хотели выбить долг в 400 тысяч, но исполнитель перестарался

В итоге именно Синькевичу предъявлены обвинения в убийстве, поджоге машины, вымогательстве и незаконных действиях с оружием. А второму фигуранту, Светчикову, – только в вымогательстве.

«Было достоверно установлено, что умысла на убийство Метельского у Светчикова не было, целью было вымогательство денег», – отметил следователь по особо важным делам главного следственного управления СК Дмитрий Васюкович.

В СК порталу TUT.BY уточнили: Светчиков взялся выполнить заказ третьей стороны по возвращению долга от Метельского на сумму более 400 тысяч долларов. В награду Светчиков рассчитывал получить 30 тысяч, а исполнителем он выбрал Синькевича.

«Но имел место эксцесс исполнителя: Синькевич вышел за рамки договоренностей, и так как Метельский отказался платить, то убил», – говорил на брифинге представитель СК.

Требователь возврата долга известен следователям, но эти данные будут озвучены уже в суде. 24 мая уголовное дело передали из прокуратуры на рассмотрение в Минский областной суд.

Убийство менеджера в Минске

Напомним, за убийство 41-летнего менеджера Андрея Косяка в Минске осенью 2018-го были осуждены 41-летний Алексей Синькевич и 29-летний Ростислав Светчиков. Их приговорили к 23 и 24 годам лишения свободы в колонии усиленного режима.

Убийство Андрея Косяка, начальника отдела продаж столичной компании, случилось в ноябре 2016-го. Накануне он собирался купить новую машину за 50 тысяч долларов – по версии следствия, ради этих денег над ним расправились.

Преступление было совершено в пейнтбольном клубе, который принадлежал тому самому Алексею Синькевичу. А с менеджером его познакомил Ростислав Светчиков, то есть водитель самого Косяка. Тело убитого нашли не сразу, а лишь после вынесения приговора по делу.

Кстати, на процессе фигурантов обвиняли не только в убийстве менеджера, но также в вымогательстве 100 тысяч долларов у семейной пары.

Убийство бизнесмена в Березино

Утром 26 сентября 2016 года на выезде из Березино (Минская область) заметили горящий автомобиль Audi Q5. На водительском кресле нашли тело погибшего мужчины.

«Местный бизнесмен выехал из дома, у него дом на окраине, около леса. Его там неподалеку тормознули, застрелили, машину подожгли. Мимо ехал местный пожарный на работу, видит: стоит машина, из нее дым идет. Открыл дверь, увидел тело, попытался его достать, по нему из леса стрелять начали, чтобы отогнать от машины. Ну, он в машину, по газам и в милицию», – рассказывал TUT.BY местный житель Виктор. По словам еще одного местного жителя, у машины все тот же спасатель увидел «человека с горящей тряпкой, который бросил ее на капот и убежал в лес».

В Березино местные уже тогда не исключали версию о заказном убийстве. По словам родных, 41-летний бизнесмен Сергей Метельский последнее время работал в Минске «антикризисным управляющим, грубо говоря». До того как стать предпринимателем, мужчина успел проработать в финансовой милиции в Борисове.

(TUT.by.)

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ…

Как сложилась судьба судьи, которая упекла в тюрьму Михаила Маринича?

Людмила Долженко прославилась тем, что в конце 2004 года приговорила политика к пяти годам усиленного режима с конфискацией имущества. Суд тогда признал Михаила Маринича виновным в краже компьютеров и другой офисной техники, которые были выделены Посольством США для организации «Деловая инициатива», которую, собственно, сам Маринич и возглавлял. При этом ни американцы, ни сама организация к Мариничу никаких претензий не имели. Госдепартамент США сделал специальное заявление, в котором сообщил, что никаких претензий к Михаилу Мариничу не имеет.

Михаил Маринич не признал свою вину и назвал дело политическим, а обвинение сфальсифицированным. Он считал, что таким образом власть мстит ему, бывшему министру, мэру Минска и дипломату, за желание пойти в президенты.

В своем последнем слове Михаил Маринич сказал: *«Я глубоко убежден, что примененные ко мне беззаконие, насилие, цинизм рано или поздно вернутся к заказчикам и исполнителям».*

Позже приговор Мариничу немного смягчили – до трех с половиной лет. Однако стресс не прошел бесследно. Здоровье политика в местах лишения свободы было серьезно подорвано. В колонии Маринич перенес инсульт и тяжелое заболевание глаз. В апреле 2006 года политик был досрочно освобожден.

Михаила Маринича не стало 17 октября 2014 года.

В январе 2009 года А.Лукашенко своим указом отправил председателя суда Минского района Людмилу Долженко в отставку. Михаил Маринич тогда сказал журналистам, что не держит обиды на судью.

«Ну а зачем обижаться? Почти все белорусские судьи – рабы… Хотя осадок от общения с судьей Людмилой Долженко у меня остался, конечно, очень неприятный. И мне даже неинтересна ее дальнейшая судьба. Пусть Бог будет ей судьей за все ее деяния… Уверен, что он ее по-своему накажет…»

Чем сегодня занимается Людмила Долженко?

«Она ушла в несудебную систему», – сказали «Народной Воле» на ее прежнем месте работы.

Сегодня Людмила Долженко не хочет ни вспоминать, ни комментировать свое судейское прошлое, особенно, как она рассматривала «дело Маринича».

«Я не хочу обсуждать ни свою прежнюю работу, ни то, чем занимаюсь сейчас. Не хочу отвечать ни на какие вопросы», – сказала Людмила Чеславовна Долженко «Народной Воле».

Марина КОКТЫШ.

ИНИЦИАТИВА

«Робім разам»

За справедливую оплату общежитий

Тысячи людей приезжают работать в Минск со всей страны. Среди них и сторонник «Говори правду» Евгений Макаров. Несколько лет назад он приехал в столицу из Гомельской области – попал по распределению на ОАО «Интеграл». Заработок на минских предприятиях выше, чем в регионах, и приятный бонус – возможность проживать в общежитии, плата за которое ниже, чем стоимость арендованной квартиры.

– В прошлом году случилось неприятное событие – плата за проживание значительно выросла. Причем как в Минске, так и по всей стране, – говорит Евгений.

Выяснилось, что облисполкомы и Минский горисполком утвердили новую инструкцию, определяющую плату за проживание в общежитиях. В результате оплата выросла более чем на 30 процентов. Евгений не захотел с этим мириться и стал действовать.

Он пошел кандидатом на местные выборы: снижение платы за проживание в «общагах» стало основным пунктом предвыборной программы. Работа продолжилась и после выборов, люди сами связывались с активистом:

– Большое спасибо хочется сказать Дмитрию и Марине, которые создали вайбер-чат. У них появились те же проблемы – плата за жилье стала составлять более трети семейного бюджета. Увы, большинство людей не могут позволить себе приобрести или арендовать квартиры – вынуждены жить в «общагах». Стартовал проект «Робім разам», цель которого добиться справедливой оплаты общежитий.

Выяснилось, что на основании инструкции Мингорисполкома вводится так называемый понижающий коэффициент арендной платы К3 – он может быть от 0,1 до 1. Но организации, в том числе и «Интеграл», стали применять коэффициент, равный единице. Отсюда и рост арендной платы, в регионах порой доходящий до 96 процентов.

Активисты инициативы «Робім разам» составили текст онлайн-петиции «За справедливую оплату общежитий», разместили ее на интернет-портале Petitions.by. Главное требование – установить для всех общежитий страны единый коэффициент К3, равный 0,1, и запретить рост оплаты за общежития больший, чем годовой рост инфляции.

– Ответ Мингориспол-кома был таков: применение коэффициента – прерогатива организации. Но половина общежитий принадлежит Министерству промышленности, и сами организации, которые строили в советские годы «общаги» «для себя», сейчас не могут ими распоряжаться, а лишь арендуют их. И тогда мы стали собирать подписи жителей под обращением к парламенту, – говорят Евгений и Геннадий.

По словам активистов, проект получил распространение по всей стране. Так, жители общежития ОАО «Белшина» из Бобруйска собрали более 2000 подписей. И им снизили плату за проживание!

– Нам удалось собрать в Минске порядка 400 подписей, – рассказывает Евгений Макаров. – Руководство «Интеграла» пошло навстречу, обратило внимание на проблему. Пенсионерам даже стали платить компенсацию. Но не везде все так радужно.

Например, жители «общаг» тракторного завода тоже собрали сотни подписей, но предприятие сумму оплаты снижать не стало.

– Так что проект «Робім разам» продолжается. И мы добьемся справедливой арендной платы за «общаги» по всей стране, – подытоживает Евгений.

Андрей ИГНАТОВИЧ.

Более подробно об инициативе «Робім разам» можно узнать на сайте www.zapraudu.info.

ЛІСТЫ З ПАЛЕССЯ

Парніковая рэспубліка Альшаны

Іван і Святлана Сыса.

Як сталічныя «Драздны»...

З вышыні птушынага палёту Альшаны нагадваюць велізарнага шматкрылага птаха, які ляцеў некуды ў вырай і прызямліўся на бяскрайняй палескай раўніне адпачыць. Ва ўсе бакі ад вёскі раскінуліся шэраватыя крылы парнікоў – меншыя і большыя, яны прагна ловяць промні шчодрага майскага сонца. А на ўездзе ў вёску з боку Турава парніковае крыло проста гіганцкае – займае прастору гектараў пяць. Здаецца, падзьме вецер, напне тыя крылы-ветразі, і паляцяць Альшаны за трыдзевяць зямель у пошуках шчаслівейшай долі.

Але адлятаць найвялікшая ў Беларусі вёска нікуды не збіраецца, сваю зямлю абяцаную альшанцы знайшлі на ўласнай радзіме. Не вабіць іх бераг турэцкі, не ў галаве ім чужыя сталіцы, яны і ў сваю наведваюцца толькі пры пільнай неабходнасці. Гэта няйначай пра кагосьці з альшанцаў пісаў аўтар славутай «Пінскай шляхты» Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (а ён бываў на Століншчыне): *«Што мне Вена, Парыж, што мне Лондан туманны? / Я найболей бацькоўскаму краю адданы»*.

Дом малітвы ў Альшанах на 1200 месцаў.

Вось і альшанцы адданыя сваёй бацькаўшчыне. Нідзе па вёсках я не бачыў столькі моладзі, як у Альшанах. Нідзе на вясковых вуліцах я не бачыў такога актыўнага аўтамабільнага руху, як у Альшанах (святлафоры на многіх скрыжаваннях). Ні ў адной беларускай вёсцы я не сустракаў такіх заможных сядзіб, як у Альшанах. Па катэджнай забудове з імі могуць паспаборнічаць хіба сталічныя Драздны. Дык там найвышэйшыя начальнікі жывуць, катэджы якіх, нібы па ўзмаху цудадзейнай палачкі, узводзяцца (за кошт крэдытаў пад смехатворныя працэнты). А альшанцы са свайго мазаля будуюцца. Адчуйце, як кажуць, розніцу.

Дзякуючы асобным СМІ, пайшла па краіне пагаласка, што ў Альшанах ледзь не буржуі жывуць, якія эксплуатуюць чужую працу і заграбаюць грошы шуфлямі. Магчыма, я дрэнны дэтэктыў, але за праведзеныя ў вёсцы паўдня не выявіў ніводнага эксплуататара. Як, зрэшты, і ніводнага альшанца, які бадзяўся б без працы. Падкрэслю: аб'ехаўшы і абышоўшы вуліц з пятнаццаць, я зусім не сустрэў лайдакоў. Нават пенсіянеры па вясковай традыцыі там не сядзяць на лаўках.

«Дзе вашы людзі?» – цікаўлюся ў магазіннай прадавачкі і чую адказ: у парніках. Кіруюся цераз поле да бліжэйшых парнікоў ды своечасова спахопліваюся – да іх магчыма дабрацца хіба на ўсюдыходзе. Пасля нядаўніх дажджоў у каляінах можна на лодках плаваць. З трэцяй спробы знаходжу больш-менш тупкую дарогу і трапляю нарэшце ў царства парнікоў. Амаль пры кожным відны людзі: хто зацягвае наверх поліэтыленавую плёнку, хто качагарыць пры вогнішчах (хоць на тэрмометры +24), хто на легкавіках з прычэпам вязе туга наладаваныя мяхі.

Чаму прападаюць залатыя агуркі?

Пры стандартным, метраў на сто ў даўжыню, парніку завіхаецца сямейная пара. Знаёмімся: **Іван Сыса** з жонкай **Святланай** акурат закончылі сённяшні збор і загружаюць агуркі ў прычэпчык свайго далёка не новага аўто. Гаспадар не супраць перавесці дых і заводзіць мяне ў парнік, дзе тэмпература градусаў на пяць вышэй. З непрывычкі мяне тут жа кідае ў пот. Як жа вы працуеце тут цэлымі днямі? – цікаўлюся ў 35-гадовага энергічнага Івана.

«Мы да гэткай работы змалку прывучаны. Парнік у нас займае 23 соткі, садзім агуркі і памідоры. З ураджаем – як пашанцуе, то больш за сезон заробіш, то менш. Ды і надвор'е ўносіць свае карэктывы. Скажам, тыдзень таму з-за дажджоў у нас патанула дзве грады памідораў. Ваду мотапомпай адкачвалі, але не ўратавалі. Штогод неабходна плёнку мяняць – пад 1000 рублёў абыходзіцца. А яшчэ дровы купляю – 7 машын за сезон, 70 кубаметраў недзе. З красавіка печкі палім, ды і цяпер ваду для паліву грэем, бо з калонкі вельмі халодная ідзе».

Пытаюся ў Івана, як яны ўдвух спраўляюцца з гэтымі агуркова-памідорнымі джунглямі, дзе клімат і парнасць – як у сярэднім цячэнні Амазонкі.

«Сярэдні сын – ужо добры памочнік, а дачка старэйшая з шасцімесячным брацікам сядзіць. І я ў парніку са школьнага ўзросту. Спачатку бацькам дапамагаў, а пасля войска свой паставіў. Усё сваімі рукамі робім, з тэхнікі ў нас толькі «Фольксваген-Пасат» з прычэпам. Ужо месяц агуркі здымаем і адвозім на Брадок (*мясцовы аптовы рынак. – **М.С.***). Там, праўда, закупшчыкі часта з цаной круцяць, за пару гадзін могуць скінуць з 3 рублёў за кілаграм да паўтара. Але здаём, нічога не паробіш».

Міжволі заглядаюся на Іванаву маладзіцу. Святлана ладная з твару, рухавая, адразу і не скажаш, што перад табой маці траіх дзяцей. Пра манікюры-педыкюры пры такой працы, зразумела, думаць не выпадае. А яна і не шкадуе.

«А дзе грошы браць? Ніякіх жа прадпрыемстваў у Альшанах няма, другой работы не знойдзеш. Вось і круцішся нібы вавёрка ў коле: купіць насення, набыць дровы, сабраць, што вырасла, адвезці на рынак. Гадоў 15 ужо так. Самая вялікая праблема – што агуркі прападаюць. Цана настолькі падае, што няма сэнсу здаваць. Шкада, бо тыя гуркі для нас як залатыя, яны ж нашым потам палітыя. Таму дзяцей думаем выправіць у горад на вучобу. А мы ўжо застанёмся ў зямлі капацца ды ім падмагаць».

Божае спрыянне і сямейнае працалюбства

Пакручастымі завулкамі я пакідаю парніковы гарадок і трапляю ў самае папулярнае месца ў Альшанах – згаданы Брадок. Альшанцы звозяць туды вырашчаную прадукцыю. У параўнанні з Брадком сталічная Камароўка – соннае царства. З усіх бакоў мяне аглушаюць аўтамабільныя клаксоны, мітусяцца рэгуліроўшчыкі, на рынак безупынна заязджаюць легкавікі з гружанымі прычэпамі, выязджаюць з прыцэлам на далёкую дарогу даўжэзныя фуры. На КПП знаёмлюся з прадпрымальнікам **Аляксандрам Грыбам**, які, даведаўшыся, з якой я газеты, запрашае да сябе дахаты.

Прасторны, абсаджаны туямі дом Аляксандра стаіць праз дарогу ад могілак, і гаспадар жартуе, што нябожчыкі – найлепшыя суседзі. Не зайздросцяць, не пляткараць, не пішуць даносаў…

Першы парнік на 10 сотак з'явіўся ў майго суразмоўцы ў 17 гадоў. Цяпер яму 37, і парнік «падрос» да 40 сотак. Альшанец вырошчвае і капусту, і моркву, і буракі, але асноўная крыніца даходу традыцыйная – агуркі.

Як і вялікая частка альшанцаў, Аляксандр належыць да хрысціян веры евангельскай, грамада якіх налічвае больш за 1800 чалавек. Малітоўны дом (з выгляду – як нясвіжскі Радзівілаўскі палац) усіх за адзін раз не змяшчае, даводзіцца паўтараць службу двойчы. Нядзельную школу пры доме наведваюць больш за 1000 дзетак.

Мне цікава пачуць, як мясцовыя людзі самі тлумачаць феномен Альшанаў. Іх эканамічны ўздым працягваецца ўжо гадоў трыццаць. Усе навакольныя вёскі ў параўнанні з імі выглядаюць куды больш сціпла. Што ж спрыяе альшанцам? Урадлівая зямля? Нейкі незвычайны спосаб гаспадарання? А можа, іхняя пратэстанцкая вера?

Аляксандр Грыб адказвае без разваг: «Божае дабраславенне, плюс мы ўсе працалюбныя. І дзеці нашы змалку працуюць, мала хто куды ў свет едзе, застаюцца на радзіме. Іх задавальняе ўзровень жыцця ў Альшанах. Хлопцы дзяўчат мясцовых і замуж бяруць. Вяселлі ў нас таксама па царкоўных правілах – безалкагольныя. І ў мяне такое было. Больш за 300 чалавек гасцей, і – ні чаркі гарэлкі ці віна. І, паверце, не сумна гулялі. Пра што ў Божым законе гаворыцца? Не крадзі, не забівай, не падманвай. Мы стараемся выконваць гэтыя правілы, моцна сваёй веры трымаемся».

Аляксандр з жонкай гадуюць двое дзетак – 13 і 14 гадоў. Але на гэтым спыняцца не збіраюцца. Мой суразмоўца прызнаецца, што будзе арыентавацца на цешчу, у якой было ажно 11 дзетак. Увогуле, у Альшанах сем'і часта шматдзетныя, дэмаграфічнай праблемы ў вёсцы даўно не існуе.

Мой суразмоўца так апісвае свой працоўны дзень: «Мы ўстаём у 5 гадзін. Да абеду зрываем агуркі, здаём. Прыязджаем дадому, абедаем, трохі адпачнём і зноў у парнік, да вечара. А вясной я і начую там, палю печкі, зробленыя з 200-літровых бочак. Звычайна, у лютым сеем у расадніцу, каля 20 сакавіка перасаджваем у парнік. Першы ўраджай маем ужо ў палове красавіка. Хімічнымі прэпаратамі не злоўжываем, перад пасадкай абавязкова ўносім арганіку. Любая культура патрабуе змены зямлі: два-тры разы агуркі пасадзілі, потым памідоры, потым капусту».

Аляксандр Грыб на ўласнай сядзібе.

Аляксандр пералічвае хваробы, што нападаюць на агуркі, называе з дзясятак гатункаў насення, што завозіцца з Галандыі, і ў мяне ўзнікае падазрэнне, што ён цішком ад усіх скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Але альшанец толькі ўсміхаецца: «Самавук я, усё спасцігаў уласным гарбом і потам. Захочаш жыць – выкруцішся. Дзяржава нам ніколі ні ў чым не дапамагла. Мы ні крэдытаў ніколі не бралі, ні льгот ніякіх не мелі. Мая цешча за 11 дзяцей мела толькі медаль «Маці-гераіня», больш нічога».

Дзяржава – не войска...

На першы погляд альшанцам на жыццё грэх скардзіцца. Бог надзяліў іх пладавітай зямлёй, бацькі з маленства прывучылі да працы, да шмат чаго яны дайшлі сваім розумам. Вынік – любому заезджаму цешыць вока. Хат*ы* (па-мясцоваму націск на другім складзе) – прасторныя мураванкі, нярэдка двухпавярховыя, з дагледжанымі газонамі, за каванымі варотамі. Дык няўжо ў Альшанах няма праблем?

Аляксандр Грыб пагаджаецца, што сучаснае жыццё беспраблемным не бывае, і прыгадвае падзею сямігадовай даўнасці: «Калі да нас прыязджаў Аляксандр Лукашэнка, мы гаварылі: па-першае, пастаўце ў Альшанах кансервавы заводзік. Ну, каб лішкі прадукцыі не прападалі. Праўда, наш хлопец з Альшанаў у Давыд-Гарадку адкрыў невялічкае прадпрыемства па перапрацоўцы садавіны-гародніны, але яго яўна недастаткова. Па-другое, у Альшанах няма бальніцы, мусім ездзіць у Давыд-Гарадок. А чаму ў пяцітысячным Гарадку бальніца ёсць, а ў васьмітысячных Альшанах няма? Па-трэцяе, нам патрэбна дарога напрасткі на Мінск, праз Мікашэвічы, а то на Жыткавічы далекавата ездзіць. Па-чацвёртае, у Альшанах практычна няма ходнікаў, па цэнтральнай вуліцы небяспечна хадзіць – рух жа вялікі. На жаль, нічога з пералічанага так і не было зроблена».

Кідаецца ў вочы і чалавечая годнасць альшанцаў. Зірнеш і адразу бачыш – ідзе гаспадар. Парукаешся з такім і адчуеш цвёрдасць працоўнай далоні. У каго парнікі большыя, той у самую пільніцу наймае сезонных рабочых (парабкаў – як напісала адна газета). Паразмаўляў я з такім «парабкам» – за няпоўны рабочы дзень ён зарабляе да 30 рублёў і на долю не наракае. А не спадабаецца гаспадар – пойдзе да іншага.

Сям'я Грыбоў абыходзіцца без наймітаў – пры патрэбе падстаўляюць плячо сваякі. Аляксандр з гонарам гаворыць пра самадастатковасць сваіх землякоў: «Бальніцу і дарогу мы ж не маем права самі будаваць. А ў астатнім хай дзяржава толькі не перашкаджае. Калі чалавек не лянуецца і працуе, у яго ўсё будзе: і добры дом, і машына. Мне ніхто нічога на талерцы не прынёс. Спачатку дапамаглі бацькі, а далей я не сядзеў склаўшы рукі, не чакаў з мора пагоды. Я часам гляджу па тэлебачанні, як начальнікі рознага рангу нешта выпрошваюць у Лукашэнкі, прыніжаюцца. Прыедзе ён кудысьці, навокал стаяць міністры, і ніхто слова папярок не скажа, насы пазвешваюць. Усё ж дзяржава – не войска, і тут аднымі загадамі зверху не абыдзешся, абавязкова патрэбна ініцыятыва знізу».

Альшаны ідуць у наступленне

Паляшуцкая пасіянарнасць і дзелавітая хватка альшанцаў праяўляюцца і ў тым, як Альшаны разрастаюцца ва ўсе бакі. Асабліва гэта відно ў давыд-гарадоцкім кірунку, дзе парнікі падступіліся ўжо да вёскі Высокае, якая ў перспектыве можа стаць адной з альшанскіх вуліц. За гадоў дзесяць дойдзе чарга і да Давыд-Гарадка, які ў свой час быў раённым цэнтрам.

На выездзе з Альшанаў я прытармožваю каля каларытнага дзеда-кашаплёта, які проста пры дарозе выставіў на продаж свой свежавыраблены тавар (не ўсім жа ў парніках завіхацца). **Іван Чынікайла** (даўні падпісчык «Народнай Волі») усё жыццё працаваў мастаком-дызайнерам у розных установах Століншчыны, але пенсію мае – кот наплакаў, усяго 220 рублёў. Вось і вырашыў падзарабіць. За тыдзень прадае кашоў на рублёў 50, за месяц мае яшчэ адну пенсію. Не прывыклі палешукі бяздзейнічаць.

Як на добры лад, прадпрымальніцкі досвед альшанцаў не шкодзіла б пераняць і ў другіх рэгіёнах краіны. А дзеля гэтага варта было б яго ўсебакова вывучыць – і з эканамічнага, і з сямейнага, і з рэлігійнага гледзішча.

Іван Чынікайла пляце кашы і чытае «Народную Волю».

Хто ведае, магчыма, і меў рацыю вялікалітоўскі канцлер Мікалай Радзівіл, калі спрабаваў пашырыць на беларускіх землях пратэстанцкую веру. Ды і альшанцы ў адзін голас цвердзяць, што ў малітоўным доме ім сілы дадаецца. Умацаваўшы евангельскай верай свае душы, яны змаглі стварыць фактычна самарэгуляванае і самадастатковае грамадства, сваю Парніковую рэспубліку Альшаны. Дзе насельніцтва штогод прыбывае, дзе п'янага днём з агнём не знойдзеш, дзе не завальваюцца на бок занядбаныя хаты. Хочацца, каб з цягам часу так сталася ва ўсёй Беларусі.

Міхась СКОБЛА.

Столінскі раён.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

План прыдумаў няўдалы – паказаць прычындалы

У гродзенскую міліцыю паскардзілася 34-гадовая жанчына: на працягу некалькіх месяцаў незнаёмы мужчына падпільноўвае яе ў адным і тым жа месцы і дэманструе, прабачце, свой пеніс. Калі вычварэнца затрымалі, ён (быццам бы прыстойны чалавек) патлумачыў свае дзеянні тым, што «гэтая жанчына дужа спадабалася».

Калі сядзеў у халадку –
У скверы, дзе снуюць прахожыя,
Запала ў сэрца дзяцюку
Жанчына – вабная, прыгожая.
«На ёй сышоўся клінам свет» –
Ужыць магчыма фразу гэткую.
Дзяцюк пайшоў за ёю ўслед,
Затым разжыўся і даведкаю.
Ён высветліў, што ўжо здаўна
Адной і той жа сцежкай скверыка
На працу тупае яна.
І што ж рабіць яму цяперака?
Ужыць патрэбна план які,
Каб неяк зблізіцца з красуняю?
Ён не Сакрат, негаваркі –
Размова даме здасца сумнаю.
Не кідкі і на прыгажосць –
Прынамсі, так сябе ацэньваў сам.
А што ж харошае ў ім ёсць?
Ён ганарыўся ўласным пенісам,
Лічыў за свой казырны туз,
Бо думаў, што гурма жаночая
З любых забаў, з усіх спакус
Да сексу ўсё ж найбольш ахвочая.
Таму і вырашыў якраз,
Што стануць заляцанні ўдалымі,
Як выстаўляцьме напаказ,
Хваліцца будзе прычындаламі.
Штодня яна «туза» самца
Рабіла змушана агледзіны.
Яму на гора, да канца
«Удалы план» не быў даведзены.
Не аценіўся кавалер
Упадабанай маладзіцаю.
І прычындаламі цяпер
Няхай здзіўляе ён міліцыю…

* * *

Каханне, кажуць, як чума,
Бо кроў тады бурліць і пеніцца.
Але як галавы няма,
Дык і не будзе толку з пеніса…

Панядзелак ці чацвер?

Мне начальнік гаворыць са здзекам,
Як «памятым» на працу прыйду:
– І чацвер можа стаць панядзелкам,
Як наглыкацца
У сераду…

Калі харошыя суседзі

Я не скажу, што так было спрадвек,
Але прыміце мой пасыл на веру:
Калі суседзяў хваліць чалавек,
Дык гэта значыць – прадае кватэру.

Сябры і ворагі

Ва ўсе часы даводзіла навука,
Дый самі ўжо з далёкае пары
Завём мы белай смерцю
Соль і цукар,
Гарэлка й лес – зялёныя сябры.

Знаёмы сюжэт

Сюжэт, які мы ведаем даўно:
У школе двор;
І пругкі мячык новенькі
Яшчэ ляціць дырэктару ў акно,
А дзеці ўжо
Гуляюць дружна ў хованкі…

Дыягназ не пацвердзіўся

Жыццё мне зноў паставіла падножку,
Бо распачаўся дзень зусім няўдала:
Я раніцай не змог нічога ў ложку,
І жонка імпатэнтам абазвала.
Мне неўспадоб дыягназ страшны гэткі,
Бо я хачу яшчэ бурлівай страсці!
У дзень той зазірнуў я да суседкі.
Дыягназ не пацвердзіўся, на шчасце…

Месца для адукацыі

Калі літаратуру падабраць
(У гэтым змог і сам пераканацца я),
Дык можна ў туалеце атрымаць
Любому
Неблагую адукацыю.

ДУХОВНАЯ ПРОБЛЕМА

Тернистый путь к храму,

или О том, как из-за бюрократических препон жители деревни Городец Сенненского района не могут построить церковь

Если следовать букве и смыслу устава Союзного белорусско-российского государства, договор о создании которого подписан 8 декабря 1999 года, на его территории должны действовать единые правовые акты, регламентирующие все важнейшие аспекты жизни граждан. В реальности же приходится порой сталкиваться с фактами, которые ставят это под сомнение. Причем даже в тех случаях, когда, казалось бы, не может быть даже малейших разночтений. Об одном из таких правовых казусов я и хочу рассказать.

История, которая тянется уже не один год, началась в небольшой деревушке Городец Сенненского района. Как и в большинстве сельских населенных пунктов, отнесенных в 1960-е годы к числу неперспективных, жизнь здесь еле теплится. Население сплошь и рядом – люди пожилого возраста. Их дети и внуки давно уже обосновались в городах и крупных поселках и наведываются в родные места лишь изредка. Пока есть чем заняться на приусадебном участке, на судьбу старики особо не ропщут; держать скот большинству уже не под силу, но без своей картошки и других овощей на скромную пенсию не проживешь, поэтому и копаются на грядках до преклонных лет. А вот поздней осенью и зимой, когда жизнь на селе практически замирает, коротать время в одиночестве невыносимо тяжело. Раньше был клуб, да его снесли. «Была бы в деревне церковь, собирались хотя бы по выходным и праздничным дням. На миру и смерть красна!» – посетовал как-то один из стариков…



Вот такой храм планируется возвести в деревне Городец Сенненского района.

Из истории

В первые послереволюционные годы православные культовые учреждения имелись в Витебской губернии не только в городах, но и почти в каждом крупном селе. В 1920–1930-е годы большевики объявили церкви беспощадную войну. С 1917-го по 1937 год в Витебске были закрыты или разрушены большинство храмов, в том числе выдающиеся памятники архитектуры Воскресенская (Рыночная) церковь, Успенский собор и многие другие. В 1961 году взорвали Благовещенскую церковь, Николаевский кафедральный собор. Пощадили лишь церковь во имя Казанской иконы Божией Матери.

Сельские церкви использовали под склады и другие хозяйственные помещения. Колокола переплавляли, все имеющиеся ценности изымали в пользу государства.

Юридически церковь была отделена от государства и на законных основаниях могла существовать, а фактически оказалась загнанной в подполье. На территории всей Витебской епархии действовали лишь девять храмов и трудились 12 священнослужителей. Крестить детей, отпевать усопших приходилось чуть ли не тайком. Хранить дома иконы позволялось лишь беспартийным, да и на них посматривали искоса. Воинствующий атеизм стал одной из причин падения нравственности.

Возрождаться религиозная жизнь в Беларуси начала в последние десятилетия. В настоящее время на территории Витебской епархии действует, по официальным данным, 178 зарегистрированных приходов, 150 храмов, имеющих престол, два мужских и четыре женских монастыря. Богослужения совершают 200 священнослужителей…

***

Существовала ли когда-нибудь церковь в Городце и окрестных деревнях, не припомнят сегодня даже местные старожилы. Собрались как-то старики у кого-то на посиделки, и родилась у них идея создать здесь религиозную общину. Заняться этим единогласно поручили одной из наиболее активных жительниц Городца Вере Богуцкой. Она добросовестно исполнила общественное поручение, и решением Витебского облисполкома 27 февраля 2017 года был официально зарегистрирован «Приход храма Покрова Пресвятой Богородицы» Белорусской православной церкви. К территории его деятельности отнесены также окрестные деревни. Председателем общины избрали Наталью Акимову.

Дело оставалось за малым – построить в Городце за счет добровольных пожертвований небольшой храм. По согласованию с местными властями землеустроительные организации Сенно и Витебска отвели под него неиспользуемый земельный участок.

Разработка собственного проекта обошлась бы слишком дорого. Решили поискать наиболее подходящий среди уже действующих храмов. Его на условиях благотворительности подарила прихожанам архитектурная мастерская Данилова монастыря из Подмосковья. По ее проекту, ставшему победителем российского архитектурного конкурса, возведен небольшой храм в местечке Малышев Лог Курской области.

Уверен: даже самые взыскательные архитекторы подтвердят: такой храм стал бы украшением не только деревни Городец, но и всего Сенненского района, при том что в эйфории от обретенной свободы в различных регионах нашей страны в спешке построили немало культовых сооружений, которые не отличаются ни оригинальным архитектурным решением, ни высоким эстетическим вкусом их создателей.

Ссылки на то, что в России, второй половинке нашего Союзного государства, все необходимые процедуры уже пройдены и утверждены на самом высоком уровне, никакого воздействия не возымели. Наталья Акимова и Вера Богуцкая попробовали было убедить чиновников от архитектуры:

– Послушайте, вам же не нужно производить никаких дополнительных работ. Все расчеты имеются в официальных документах российских коллег. Остается лишь проверить и утвердить их. Такие услуги приход оплатит. У нас же Союзное государство!

Ответ был неумолимым:

– Или проходите действующую в Беларуси процедуру, заплатив белорусским архитекторам за полную переработку проекта по коммерческой цене, или разрешения на возведение храма не получите!

Никакие заверения о том, что анализ грунтов под будущим храмом проведен, авторский надзор за соблюдением проекта гарантирован, а надежность строительных конструкций при сдаче объекта будет подтверждена заключением соответствующих компетентных органов, не помогли… Кстати, если бы такое строение было возведено как самострой, таких основных документов было бы достаточно, чтобы принять объект в эксплуатацию.

Я не склонен подозревать белорусских архитекторов в рвачестве. Наверняка расценки на проведение проектных работ устанавливает рынок. Думаю, и у них нет сомнений по поводу профессионализма российских коллег. Быть может, и рады были бы выдать заключение для прихожан на испрашиваемых условиях, да «компетенция» и инструкции не позволяют. Вдруг какая-нибудь контролирующая организация, проведя проверку и заметив расхождение в трактовке буквы закона, решит, что это сделано «по кумовству» или за взятку! Разве мало таких случаев?

Обращения прихожан Городца в самые высокие инстанции страны также оказались безрезультатными. По неофициальным каналам им сообщили: «Разрешить вашу проблему может только Президент Республики Беларусь, приняв соответствующее решение по этому конкретному случаю…» Тут мне хочется сделать небольшое отступление от темы.

Имплементация, трансформация на внутригосударственном уровне российских и белорусских правовых норм в правовые нормы и подзаконные акты Союзного государства, обязательные для обеих стран, конечно, процесс непростой. Но ведь с момента создания этого уникального в своем роде межгосударственного объединения прошло уже без малого 20 лет, в свое время в СССР за такой срок обещали построить коммунизм! Более того, еще в 1997 году учрежден государственный праздник День единения народов Беларуси и России, отмечаемый 2 апреля. Тогда напрашивается вполне логичный вопрос: мы и вправду интегрируемся или Союзное государство лишь миф, красивая пропагандистская обертка, призванная скрыть действительное положение дел?! Неужели согласование архитектурных и других норм, касающихся повседневной жизни людей, относится к числу неразрешимых проблем?

Знаю, что в порыве отчаяния прихожане деревни Городец собираются обратиться за помощью к митрополиту Минскому и Заславскому, Патриаршему Экзарху всея Беларуси Павлу в надежде на то, что он сумеет донести их беду до Главы государства.

Воистину, чудны твои дела, Господи!

Игорь КЛЕНОВ.

От редакции

Принимая решение о публикации этого материала, мы поинтересовались: а если российский проект все же отдать на переработку белорусским архитекторам, то в какую сумму выльется их работа? И удивились: по предварительным расчетам примерно в 50 тысяч белорусских рублей. Понятно, что такая сумма становится неподъемна для небольшого прихода, это чуть ли не треть всех средств, планируемых на возведение храма.

Хочется надеяться, что митрополит Минский и Заславский, Патриарший Экзарх всея Беларуси обратится к президенту Александру Григорьевичу Лукашенко и с его разрешения проблема будет решена.

За тем, как будет развиваться ситуация, «Народная Воля» будет следить и проинформирует своих читателей.

МЕРКАВАННЕ

Не зачыняйце дзверы архіваў

Ваенныя навалы перакочваліся праз Беларусь то з захаду на ўсход, то з усходу на захад. Яны неслі нашаму люду вялікія няшчасці. Якім прыгожым у першай палове XVI стагоддзя быў Полацк! І што з ім сталася, як, дарэчы, і з іншымі гарадамі, у выніку Лівонскай вайны (1558–1583 гг.)? А якія згубы панесла наша зямля ад Трынаццацігадовай (1654–1667 гг.), Паўночнай (1700–1721 гг.) і іншых войнаў? Застаецца толькі здзіўляцца, як увогуле беларусы захаваліся: вынішчалася ўсё – гарады, людзі, храмы, матэрыяльныя рэсурсы... Вазьміце тую ж Паўночную вайну: па ўласнаручным загадзе Пятра І быў узарваны Сафійскі сабор, спалены ўшчэнт Віцебск, Магілёў, Орша... Але ж мы, беларусы, выстаялі, падняліся з калень. І ўсё грамчэй і выразней кажам сабе і сусветнай супольнасці аб нашай адметнасці, нашай беларускасці, нашай дзяржаўнасці.

Сёння ніхто не адмаўляе сталінскіх рэпрэсій. Яны былі. Гісторыкі яшчэ доўга будуць спрачацца, падлічваючы, колькі людзей было расстраляна, колькі загінула ў лагерах і турмах, на пасяленнях…

Чым кіруюцца тыя, хто зачыняе дзверы архіваў для наведвальнікаў, і ў першую чаргу для гісторыкаў? Праўду не схаваеш, як бы хто ні імкнуўся гэта зрабіць. Вось адзін з дакументаў, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Яго аўтар да арышту органамі НКУС БССР працаваў рэдактарам газеты «Звязда», у 1939 годзе ён пісаў: «*Днём і ноччу з кабінетаў следчых, якія знаходзіліся ў турме, несліся дзікія крыкі, лямант і стогны тых, каго збівалі і катавалі. З «допытаў» людзі вярталіся ў камеры з разбітымі галовамі, ссечаныя, у кровападцёках і сіняках на спіне і грудзях, з распухлымі тварамі, вырванымі валасамі, выкручанымі рукамі, апухлымі нагамі. Гэта стварала ў турме такое становішча, што ў гэты час у камеры многія падследныя гаварылі: напішу ўсё, што патрабуюць, толькі б застацца жывым, непакалечаным, не звар'яцець. Дзесяць гадоў дадуць – шчасце будзе. Потым ужо з лагераў буду дабівацца праўды*».

У 1937–1938 гадах беспадстаўныя арышты людзей набылі павальны характар. Ніхто не быў застрахаваны ад арышту, расстрэлу, ссылкі. Начны чамаданчык быў напагатове літаральна ў кожным доме, у кожнай кватэры. На пачатку 1939 год першы сакратар ЦК КП(б)Б П.Панамарэнка канстатаваў, што апошнім часам аднавілі членства ў партыі 2,5 тысячы камуністаў: «*...Восстановлены не потому, что партийные органы или партия нашла возможность им что-то прощать, этим людям. Не потому. А потому, что им нечего прощать, они в громадном большинстве были исключены без каки бы то ни было оснований, по провокаторским данным...*»

У імя чаго адна частка грамадства забівала другую, прыніжала, навязвала сваю волю? Што рухала тымі, хто забіваў? Хто яны, носьбіты ўсталявання новых рэвальверных сацыяльных каштоўнасцяў? Нельга на крыві суродзічаў усталёўваць сацыяльныя ідэалы! Такія ідэалы па азначэнні не здольны быць ідэаламі. Гэта падман. Падман, які рана ці позна павінен быў стаць і стаў рэчаіснасцю.

Для Беларусі менавіта Курапаты сталі мяжой паміж мінулым і будучым. Курапаты – гэта больш, чым проста расстрэлы бязвінных людзей у 30-я гады мінулага стагоддзя. Гэта змаганне народа за праўду, за справядлівасць. Людзі баранілі і будуць бараніць крыжы як сваю святыню. Такіх людзей перамагчы нельга. Крыжаломам маглі займацца вельмі блізарукія людзі.

Прапаную распрацаваць праект і ўсталяваць у цэнтры Мінска – у скверы на перакрыжаванні вуліц Карла Маркса і Камсамольскай – помнік ахвярам сталінскіх рэпрэсій.

І наогул, не трэба зачыняць дзверы архіваў. Праўду нельга схаваць.

Васіль РУСОВІЧ, сацыёлаг, кандыдат гістарычных навук.

ЧЫТАЧ ПРАПАНУЕ...

З павагай – да сваіх герояў

Падтрымліваю прапанову знакамітых людзей краіны аб ушанаванні памяці народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча. Галасую за гэта, як кажуць, абедзвюма рукамі. Лічу, што варта перайменаваць вуліцу К.Маркса ў вуліцу **Ніла Гілевіча**.

І наогул з тапанімікай у сталіцы трэба сур'ёзна разбірацца. Даніну павагі трэба аддаваць тым асобам, якія маюць вялікія заслугі перад Беларуссю, а не тым, якія нам навязаў бальшавіцкі рэжым. Прапаную перайменаваць вуліцу Энгельса ў вуліцу **Рыгора Барадуліна**, вуліцу Леніна – у вуліцу **Адама Міцкевіча**, вуліцу Кірава – у вуліцу **Генадзя Бураўкіна**, вуліцу Куйбышава – у вуліцу **Міхала Клеафаса Агінскага**, вуліцу Валадарскага – у вуліцу **Братоў Луцкевічаў**, вуліцу Берсана – у вуліцу **Эдварда Вайніловіча**, вуліцу Мяснікова – у вуліцу **Глеба Менскага**, вуліцу Ціміразева – у вуліцу **Васіля Быкава**, вуліцу Клары Цэткін – у вуліцу **Валянціны Мінскай**, вуліцу Калініна – у вуліцу **Князя Рагвалода**, вуліцу Кнорына – у вуліцу **Князёўны Рагнеды**, праспект Дзяржынскага – у праспект **Францішка Багушэвіча**, праспект газеты «Праўда» – у праспект газеты **«Народная Воля»**, праспект Любімава – у праспект **Язэпа Лёсіка**.

Чакаю ад чытачоў «Народнай Волі» больш слушных прапаноў. Трэба браць прыклад з братоў-украінцаў, якія правялі дэкамунізацыю за 2–3 гады.

Жадаю вам, сябры-народавольцы, усяго самага найлепшага – здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў, Божай дапамогі ў добрых справах!

Ваш чытач з 1995 года –

Сяргей ГЕРАСІМЧЫК.

P.S. Абавязкова трэба прыбраць з карты Мінска такіх дзеячаў, як Свярдлоў, Сувораў, Ландар, Лібкнехт і г.д.

РЭХА

...Хоць малою цябе і завуць

Дзень добры, паважаная «Народная Воля»!

У адным з нумароў прачытаў матэрыял Міхала Карневіча з вёскі, у якой пражывае ўсяго сем пенсіянераў. На вялікі жаль, і ў нашым раёне такіх вёсачак не адзін дзясятак. У сувязі з гэтым хачу падзяліцца і я сваімі вершаванымі радкамі.

Не жыве – дажывае вёска.
Рэдка дзе ўжо пілы звіняць.
Толькі вокны, забітыя дошкамі,
З крыўдным болем і сумам глядзяць.

Як прайсці, як праехаць міма
І на поўныя грудзі мне не ўздыхнуць:
Не знікай, мая вялікая Радзіма,
Хоць малою цябе і завуць!..

Генадзь МІРОНЧЫК, жыхар вёскі Куправічы Іўеўскага раёна.

ИХ ДЕМОКРАТИЯ

В Литве на выборах победил Гитанас Науседа

Он набрал в два раза больше голосов, чем его соперница Ингрида Шимоните. Супруга нового президента Литвы – эксперт по протоколу, дочери живут и учатся за границей. За Науседу проголосовали 65,86% избирателей, Шимоните получила 32,86% голосов. Всего в выборах приняли участие 53% избирателей.

Как сообщает ru.delfi.lt, Гитанас Науседа обратился к собравшимся на площади Даукантаса, поблагодарил за поддержку и поздравил всю Литву.

«Наверное, не для того мы собрались, не ради музыки здесь море людей, не ради этого люди сейчас смотрят на экраны и задаются вопросом, что же сейчас будет, будет ли все по-прежнему или будет иначе, лучше или хуже. Все зависит от ожиданий, точно все будет иначе, но сегодня самое сильное чувство в моей груди – это огромное чувство благодарности жителям Литвы, которые выразили настолько глубокое доверие», – обратился к собравшимся Науседа.

Он поблагодарил свою команду, а также Ингриду Шимоните, назвав ее соперником, о котором можно только мечтать.

«Она – искренний, мудрый, целенаправленный и рациональный человек, который, ко всему прочему, я думаю, будет играть важную роль в политике Литвы в ближайшие десятилетия. Я надеюсь, что с уважаемой Ингридой у нас сложатся дружеские отношения и мы много сможем сделать на благо Литвы», – сказал Науседа.

Науседа призвал политические силы Литвы к объединению и пообещал сделать президентский дворец более открытым для всех социальных групп.

Избранный президент также отметил, что несколько изменил бы риторику в отношении России, однако после того, как Москва изменит свое отношение к Украине.

Первый тур президентских выборов прошел в Литве 12 мая. В них участвовали 9 кандидатов. Шимоните в первом туре набрала 31,31% голосов, а Науседа – 30,94%. Шимоните поддерживает та же партия, что выдвигала Далю Грибаускайте десять лет назад – «Союз Отечества – Литовские христианские демократы». Науседа – беспартийный кандидат. Он входил в руководство Банка Литвы и работал в бизнесе.

Второй срок полномочий нынешнего президента Литвы Дали Грибаускайте заканчивается в июле.

ДОСЬЕ

Его жизнь...

19 мая Гитанасу Науседе исполнилось 55 лет. Он профессиональный экономист, кандидат наук. Проходил практику и стажировку в Германии и США, владеет немецким, английским и русским языками. Работал на руководящих должностях в Банке Литвы, в 2004–2009 гг. был советником президента Валдаса Адамкуса.

Жена Диана Непайте-Науседене, инженер по образованию, преподает международный протокол в бизнес-школе Вильнюсского университета. Она активно участвовала в избирателей кампании мужа, сосредоточившись на теме социального обеспечения и поддержки пожилых людей, лиц с ограниченными возможностями, больных и детей-сирот. Две дочери первой супружеской пары Литвы получают сегодня образование за рубежом: 26-летняя Гедайле заканчивает магистратуру по архитектуре в Бельгии, а ее 23-летняя сестра Угне стажируется в парижском университете Винсент Сен-Дени, после чего намерена поступить в магистратуру в Южной Корее. Обе дочери президента Науседы неоднократно декларировали свое желание всего в жизни добиться самостоятельно. Как и их отец.

Известность Гитанаса Науседы никогда не носила скандального характера. У него, как отмечает литовская пресса, ровная интеллигентная манера общения, он вызывает уважение своим спокойствием, умением говорить просто о сложных вещах. В качестве главной своей задачи как будущего президента Гитанас Науседа видел повышение уровня жизни рядовых граждан Литвы. Он не социал-демократ по убеждениям, однако можно судить, что он значительно левее во взглядах, чем его предшественница Грибаускайте. По его словам, «страна, в которой лишь 10 или 15 процентов граждан пользуются всеми благами, не является страной, которую хотели бы защищать все 100 процентов граждан». Науседа считает также возможным повышение оплаты труда бюджетников, поскольку тезис о том, что рынок способен отрегулировать в том числе и этот вопрос, по мнению нового президента, является ложным.

Гитанас Науседа хорошо образован, знает национальную историю и культуру. При этом, по его мнению, современная Литва должна видеть образцом национальной политики толерантность эпохи Великого Княжества Литовского. Он предложил избавиться от словосочетания «национальное меньшинство», ориентируясь на понятие «национальная община». Еще в прошлом году Науседа, выступая в Вильнюсском колледже социальных наук, пообещал, что первой страной, которую он посетит с визитом после победы, станет Польша, и сейчас, во время избирательной кампании, неоднократно подчеркивал роль литовского элемента в польской культуре, апеллируя к именам Адама Мицкевича и Чеслава Милоша.

Как и положено экономисту-прагматику, Науседа намерен развивать отношения с Беларусью, которая является важным торгово-экономическим партнером Литвы. Весьма вероятно, что он понизит уровень накала в двусторонних отношениях по поводу Островецкой АЭС. Вместе с тем нужно помнить, что Литва – парламентская республика, и ни депутаты сейма, ни правительство не смогут уйти от критики в адрес этого проекта, в реализации которого они видят потенциальную техногенную угрозу своей стране. А значит, президент будет определять далеко не всё.

Гитанас Науседа не против улучшения отношений с Россией, однако такое улучшение он ставит в зависимость от изменения российской политики в отношении Украины. Такая риторика позволяет предположить, что внешнеполитический курс Дали Грибаускайте, скорее всего, продолжится.

ЕВРОПА

Лидирует партия Ле Пен

По информации социологического института Elabe, во Франции на выборах в Европарламент правопопулистская партия Марин Ле Пен получает 24 процента голосов. Второе место социологи отдают «Республике на марше» президента страны Эммануэля Макрона. За нее проголосовали 22,5 процента избирателей во Франции, сообщает Elabe. По результатам опросов избирателей при выходе с избирательных участков, партия «Европа-Экология-«Зеленые» с 13 процентами голосов может занять третье место.

ТЕХНОЛОГИИ

В Германии построили поселок, здания которого производят больше энергии, чем потребляют

Поселок состоит из 13 зданий – девяти индивидуальных домов и четырех сдвоенных коттеджей, построенных из керамических камней с мощным наружным утеплением.

Здания спроектированы и построены по стандарту KfW-Effizienzhaus 55 – это стандарт зданий повышенной энергоэффективности немецкого Банка развития KfW. Цифра «55» означает, что расход первичной энергии здесь не должен превышать 55% от действующей государственной нормы. Банк финансирует строительство таких зданий с помощью специальных льготных кредитов. Здания поселка отличает крайне низкая потребность в тепловой энергии.

На каждом здании установлена солнечная электростанция. На индивидуальном доме – мощностью 11,8 кВт, в сдвоенном коттедже – по 7,56 кВт на семью. Она комбинируется с литий-ионным аккумуляторным накопителем электроэнергии емкостью 6,4 кВт·ч. Также в здании установлен накопитель тепловой энергии, буферный бак емкостью 1500 л на дом и 1000 л на семью в сдвоенных коттеджах.

Производство тепла и горячей воды осуществляется тепловым насосом воздух-вода, электроэнергия для работы которого в соответствии с настройками в первоочередном порядке поступает от фотоэлектрической электростанции. В подобных зданиях «серийно» необходима вентиляционная установка с рекуперацией тепла (теплообменом). В данном случае используются установки с заявленным коэффициентом теплообмена 90%.

Расчетные совокупные энергетические затраты на индивидуальный дом составляют 6651 кВт·ч в год, на половину сдвоенного коттеджа – 6050 кВт·ч в год. При этом плановая выработка солнечных электростанций составляет 13.168 и 8343 кВт·ч в год. То есть в индивидуальном жилом доме выработка энергии за год в два раза превышает потребление.

Здания оснащены устройствами для зарядки электромобилей. Избыток производимой энергии может использоваться таким образом – сегодня в Германии выгоднее потреблять собственное электричество, чем продавать его в сеть.

КАЛЕЙДОСКОП

Авиакомпания Delta разбила старинную виолончель

Студент музыкального колледжа-консерватории Университета Цинциннати (США) утверждает, что, несмотря на использование аэрокофра, его виолончель, изготовленная мастером Уильямом Хиллом в 1840 году, была разбита в полете.

Ходжун Чой, студент музыкального колледжа-консерватории Университета Цинциннати, опубликовал фотографии с повреждениями своего инструмента, которые он обнаружил после перелета рейсом авиакомпании Delta Airlines из США в Корею.

У виолончели работы мастера Уильяма Хилла (1840) обнаружились масштабные трещины на нижней обечайке, а в одном месте обечайка пробита насквозь. Такие повреждения были нанесены инструменту, который перевозился в легком твердом футляре, размещенном внутри аэрокейса марки BAM.

В группе Internet Cello Society на Facebook студент также сообщил, что стоимость ремонта составит около 8000 долларов США.

Из комментариев к этой записи также выяснилось, что виолончелист пропустил окончание действия страховки на свой инструмент. В связи с этим Ходжун Чой рассматривает возможность продажи трех своих смычков, чтобы начать реставрацию инструмента, не дожидаясь ответа авиакомпании.

В правилах Delta установлен предел ответственности перевозчика в размере 9,07 доллара США за фунт веса багажа, либо до 640 долларов США за багажное место, если особая ценность багажа не указана пассажиром дополнительно (за что взимается плата). Но и в этом случае ответственность перевозчика не превысит 5000 долларов США.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

50 фактаў
пра бел-чырвона-белы сцяг

(Працяг. Пачатак у №40.)

11. 1824–1825 гады. Галаўны ўбор палкоўніка Беларускага гусарскага палка.

12. 1824–1825 гады. Ківер ніжніх чыноў Гарадзенскага лейб-гвардыі гусарскага палка.

13. 1840 год. Герб Віцебскай губерні (з фондаў Дэпартамента геральдыі Расійскай імперыі).

14. 1850 год. Герб Лепеля (з фондаў Дэпартамента геральдыі Расійскай імперыі).

15. 1872 год. Бел-чырвона-белыя сцягі на карціне Яна Матэйкі «Стэфан Баторый пад Псковам».



Карціна Яна Матэйкі «Стэфан Баторый пад Псковам».

16. 1863 год. У час паўстання 1863–1864 гадоў, калі **Кастусь Каліноўскі** вярнуўся да герба «Пагоня», ёсць падставы меркаваць, што ён адрадзіў і бел-чырвона-белы сцяг: у Вільнюскім гістарычна-этнаграфічным музеі захоўваецца трыкутны сцяжок тых часоў, на якім усярэдзіне ўздоўж белага поля праведзена чырвоная паласа.

17. 1909–1912 гады. Бел-чырвона-белымі стужкамі карыстаюцца сябры гурткоў дэмакратычнага беларускага студэнцтва ў Санкт-Пецярбургу (з успамінаў Я.Ф.Сушынскага).

18. 1916 год. Сцяг з бел-чырвона-белым палотнішчам мела арганізацыя «Сувязь незалежнай Беларусі», якой кіраваў Вацлаў Ластоўскі.

19. Люты 1917 год. Паводле шматлікіх сведчанняў, праект сучаснай выявы бел-чырвона-белага сцяга распрацаваў беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч Клаўдзій Дуж-Душэўскі не пазней за 1917 год.

Спробу гістарычнай рэканструкцыі працэсу стварэння сцяга Дуж-Душэўскім зрабіў блогер **Skepsus:**

«Лютаўскім вечарам 1917-га Клаўдзій, перабіраючы старыя кнігі, намагаўся ў бясконцых спробах вынайсці нацыянальны сцяг, які павінен быў стаць сімвалам адроджанай Беларусі. З колерамі ўсё было зразумела (белы і чырвоны), але праблемай заставаўся малюнак.

Пошукам рашэння задачы перашкаджала дыскусія, якую ў суседнім пакоі вялі сябры па руху абуджэння.

Раптам адзін з іх з крыкам «Дзе два беларусы, там тры партыі» выскачыў з памяшкання як ашпараны. Гэта стала тым штуршком, які прывёў Клаўдзія да адкрыцця: дзве белыя паласы на трохпалосным сцягу.

Ранкам бел-чырвона-белы сцяг быў зацверджаны як прыгожы, лаканічны, які адпавядае законам геральдыкі. Аб сапраўднай тэарэтычнай падаплёцы Дуж-Душэўскі разважліва змаўчаў».

Клаўдзій Дуж-Душэўскі (злева), снежань 1919 года.

20. 10–13 сакавіка 1917 года. Бел-чырвона-белы сцяг стаў галоўным элементам падчас свята «Дзень беларускага значка», калі бел-чырвона-белыя адзнакі, кукарды і сцяжкі можна было пабачыць на вуліцах Менска. Сцягі, пашытыя паводле эскіза **Клаўдзія Дуж-Душэўскага,** былі разасланы ў мясцовыя арганізацыі.

21. 5 жніўня 1917 года. На 1-й сесіі Беларускай цэнтральнай рады было вызначана, што ўсе вайскоўцы-беларусы мусяць насіць бел-чырвона-белую стужку як дадатковы знак адрознення.

22. Снежань 1917 года. У Менску пад бел-чырвона-белымі сцягамі распачаў сваю працу Першы Усебеларускі кангрэс.

Паводле ўспамінаў **Канстанціна Езавітава:**

«Адкрыццё Першага Усебеларускага кангрэса было дужа ўрачыстае. Пры дзвярах будынка стаяла варта Першага Менскага беларускага палка, сцэна была ўпрыгожана нацыянальнымі сцягамі і гербам «Пагоня».

Цэлы пакет старых папер, датаваных пачаткам XX стагоддзя, удалося ўратаваць падчас рэканструкцыі Купалаўскага тэатра ў 2013 годзе. Сярод унікальных знаходак – выява бел-чырвона-белага сцяга на шэрым кардоне. Адмыслоўцы не выключаюць, што такія карткі выкарыстоўвалі падчас галасавання дэлегаты Першага Усебеларускага кангрэса ў снежні 1917 года.

Выява бел-чырвона-белага сцяга на шэрым кардоне. 1917 год.

23. 25–27 студзеня 1918 года.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўваўся падчас Беларускай нацыянальнай канферэнцыі.

24. 19 лютага 1918 года. Упершыню беларускі сцяг узняўся над будынкам губернатарскага палаца ў Менску пасля выгнання бальшавікоў.

(Працяг у наступных нумарах.)

«БЕЛЫЯ ПЛЯМЫ» ГІСТОРЫІ

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

«ТРИ ХРУПКИЕ ЖЕНЩИНЫ», або Цьмяныя месцы адной вядомай гісторыі

Пра ліквідацыю Вільгельма Кубэ шмат напісана кніг і шмат створана фільмаў. Кнігі даследчыцкія, сур'ёзныя, фільмы, на жаль, павярхоўныя і спекуляцыйныя. Адразу агаваруся: мы не будзем удзельнічаць у дыскусіі, ці трэба было ўвогуле забіваць кіраўніка акупацыйнай адміністрацыі Генеральнай акругі Беларусь. Кубэ знішчылі не таму, што ён быў больш жорсткі за свайго непрыяцеля і пераемніка Карла фон Готберга; ён заплаціў жыццём за сваю пасаду.

Усе этапы непасрэднай падрыхтоўкі замаху («угаворванне» пакаёўкі, перадача міны, устаноўка прылады ў спальні і г.д.) падрабязна распісаны даследчыкамі. За кадрам застаецца структура, якая займалася арганізацыяй і каардынацыяй дзеянняў. Найперш таму, што ўсе этапы аперацыі трымаліся ў строгім сакрэце дзеля бяспекі ўдзельнікаў і поспеху справы. А галоўнае – з-за страты асноўнага фігуранта: знік камандзір атрада, які трымаў у руках усе нітачкі кіравання.

Пішучы кнігу пра Лагойшчыну, распытваючы землякоў, я вывучыла шмат крыніц і выявіла некалькі цьмяных мясцін, якія тычацца амаль дэтэктыўнай гісторыі часоў акупацыі.

Загадка першая

Чаму Масква не валодала інфармацыяй?

Вестка з Мінска ўскалыхнула Крэмль. Усе губляліся ў здагадках, хто здзейсніў дзёрзкі замах і пры якіх абставінах гэта адбылося. У мастацкай стужцы «Гадзіннік спыніўся апоўначы» задума сыходзіць ад групы падпольшчыкаў. Але на канец 1942 года мінскае падполле было выкрыта і разгромлена (яго прызнаюць толькі праз дваццаць гадоў), а да Кубэ падабраліся восенню 43-га. Загад даў сам «вялікі стратэг», які, няйначай, не мог дараваць сабе страту вялікіх тэрыторый, прамысловых і чалавечых рэсурсаў і прагнуў рэваншу.

Па ідэі ўдзельнікі паспяховай аперацыі павінны былі як найхутчэй паслаць радыёграму ў Маскву. Першым адрапартаваў Берыя: маўляў, гэта пастараліся людзі з яго ведамства (што не адпавядала сапраўднасці). П.Панамарэнка гарой стаяў за партызанаў, хаця таксама не ведаў імён і дэталяў. Чаму ж сувязная і партызанка атрада «Дзімы» Марыя Осіпава не далажыла ў атрад пра ўзрыў у доме гаўляйтара, а камандаванне атрада не адсправаздачылася наверх? Натуральна, што з-за гэтага прамаруджвання (ці промаху?) канкурэнты ліхаманкава шукалі зачэпкі, каб прыпісаць заслугу сабе.

Гісторыкі ў адзін голас сцвярджаюць, што Осіпава, Мазанік і сястра Мазанік Валянціна Шчуцкая пасля закладкі выбуховай прылады падаліся ў партызанскі атрад на Лагойшчыну. Яно-то так, але чаму яны не адразу дабраліся ў Руднянскі лес – да базы атрада? Можна дапусціць, што а) іх спецыяльна прытрымалі на выпадак, калі фашысты пойдуць па іх слядах; б) самі жанчыны баяліся праследавання і палічылі за лепшае «растварыцца» ў вёсцы.

Алена Мазанік увогуле не ведала, дзе атрад базіруецца. Што яна падскоквала ад радасці «Папкі няма! Папкі няма!», я даведалася ад сваёй школьнай таварышкі Ларысы Марцынкевіч (цяпер – Бутманава). Адбывалася гэта ў Ларысінай бабулі Мальвіны Прахаровіч, жыхаркі добра мне вядомай вёскі Янушкавічы. Гаспадыні не сказалі, што за госця ў яе начавала. Пэўна ж, важная птушка, бо на склепе для падстрахоўкі партызаны паставілі кулямёт.

Але і Осіпава не спяшалася ў атрад, а яна ж дакладна ведала туды дарогу! З ёй сустрэўся ў той самай вёсцы будучы пісьменнік Уладзімір Карпаў. Маладому разведчыку запомнілася, як жанчына ў тазіку мыла свае доўгія валасы (з кнігі «Прызнанне ў нянавісці і любві», 1976). Верагодна, удзельніц аперацыі «Кабан» размясцілі непадалёку. Памочнік камандзіра Мікалай Фёдараў даведаўся пра смерць Кубэ толькі праз чатыры дні з нямецкай газеты! То як ён мог паведаміць у Цэнтр пра такую значную падзею, калі сам быў не ў курсе?

З усяго гэтага можна зрабіць выснову, што Осіпава мела справу не з ім, а з самім камандзірам – Давідам Кеймахам (Дзіма – яго псеўданім). Восем дзён перад тым Кеймах паляцеў у Маскву па неадкладнай справе. Што яго няма ў атрадзе, сувязная магла ведаць. Што яго няма сярод жывых, не ведаў ніхто. Кеймах быў тым звяном, без якога рассыпалася схема. Працэдуру данясення маглі не абгаварыць. (Не спадзяваліся? Не паспелі?)

Што менавіта камандзір, а не прысланы вышэйшы па званні памочнік, быў асноўным арганізатарам ліквідацыі гітлераўскага чына, пісаў у сваіх мемуарах вядомы ўдзельнік партызанскага руху Раман Мачульскі. Працытую: «Эта сложная операция была разработана командиром спецотряда Давидом Ильичом Кеймахом совместно с начальником штаба отряда Дмитрием Федоровичем Чуприсом и начальником разведки и контрразведки Яковом Ивановичем Свентаржицким» («На семи ветрах»).

Біёграфы М.Фёдарава пісалі, што ён адзін займаўся «справай Кубэ» (для чаго і быў прысланы з Цэнтра), а Кеймах нібыта «граміў фашыстаў». Між тым атрад ГРУ Цэнтральнага штаба Арміі спецыялізаваўся на разведцы і не ўступаў у лабавыя сутыкненні з ворагам. Паводле сведчання партызана Ю.Волкава, камандзір прызнаваўся: «У нас узбраення на тры гадзіны бою». Марыю Барысаўну Осіпаву да супрацоўніцтва прыцягнуў менавіта Дзіма. Памочнік жа выконваў даручэнні (у прыватнасці, сустракаўся з М.Пахлябаевым), што азначае – таксама прымаў удзел. Падкрэслю: удзельнічаў, дапамагаў, але фактычна кіраваў не ён.

Загадка другая

Падазроная цішыня вакол збітага самалёта

Давід Кеймах прасіўся ў Маскву яшчэ ў пачатку жніўня, каб пракансультавацца з камандаваннем па важных пытаннях. 21 жніўня 1943 года Цэнтр паведаміў: «Вылет разрешаю. Оставьте за себя Колокола. Захватите с собой документы, письма и списки личного состава». Борт прыбыў у ноч з 6 на 7 верасня з грузам і дзвюма радысткамі. Але камандзір прылётам не скарыстаўся. Ці не адправіў ён гэтым рэйсам жонку з дачкою? (Дакладна вядома, што ўлетку пры ім знаходзілася сям'я, пра што распавяла жыхарка Баброў Л.П.Ваўчок.)

У ноч з 12 на 13 верасня Дзіма сакрэтна пакідае атрад. Фёдараў паведамляе ў Маскву пра вылет чарговага борта. І толькі 29 верасня (!) у атрадзе атрымалі радыёграму, што самалёт не вярнуўся на аэрадром: «Есть данные, что Дима, видимо, погиб. Продолжаем проверять. Если вам станет известно что-либо другое, немедленно сообщите».

Давід Кеймах.

Між тым Беларуская Вікіпедыя сцвярджае, быццам праз некалькі гадзін у брыгаду «Народныя мсціўцы» прыйшла тэлеграма: «Палкоўнік Варанянскі загінуў пры пералёце лініі фронту». Тут відавочная недарэчнасць, хай гэтым разыходжаннем займаюцца спецыялісты.

Дзеяннямі атрада з Цэнтра кіраваў палкоўнік Шэсцернеў, які падпісваўся псеўданімам «Валерый». Акрамя Кеймаха і Варанянскага ў Маскву ляцелі І.Рыбакоў і А.Захараў. Усе чацвёра праходзяць на мемарыяльным сайце ГРУ ЦША і лічацца камандзірамі дыверсійна-разведвальных груп. У тым ліку і акружэнец В.Варанянскі.

Самалёт з камандзірамі на борце тройчы прызямляўся на лясных аэрадромах, забіраў раненых, вёз важныя звесткі ад лагойскіх партызанаў і «наградныя лісты», аднак праз лінію фронту не пераляцеў: быў збіты, мяркуецца, у раёне Вялікіх Лукаў. Афіцыйная версія такая: быццам ляцелі камандзіры на сустрэчу са

Герой Савецкага Саюза Алена Мазанік сярод дзімаўцаў ля Кургана Славы. 1974 год.

Сталіным. Выходзіць, што Кеймах няўдала падсусдзіўся. Але чаму грамадскасць дасюль не ведае ні членаў экіпажа, ні нумара збітага борта?

Яшчэ 7 верасня 1943 года Кеймах прысутнічаў на сходзе камандзіраў Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны. Далей вайсковае начальства паводзіць сябе так, быццам яго не існавала ў прыродзе.

Загадка трэцяя

Выкраслены з гісторыі Вялікай Айчыннай

Масква не збіралася задавальняцца чуткамі і домысламі з акупаванага Мінска і запатрабавала прысутнасці галоўных асоб. Група вылецела 12 кастрычніка. Да маёра Фёдарава і жанчын далучыліся пяць чалавек ад «Артура» (І.Залатара). На пытанне, хто кіраваў аперацыяй, Фёдараў сціпла адказаў: «Колокол». Гэта значыць – назваў сябе. Ці прагучала імя Кеймаха – невядома. Ці паведамілі генералісімусу пра збіты борт? Наўрад, бо пра гэтае здарэнне яшчэ паўгода маўчалі. Зрэшты, маўчаць дасюль як вады ў рот набраўшы. Адзін сучасны гісторык абгрунтоўвае гэты факт проста: маўляў, няма ніякіх звестак пра трагедыю, не засталося рэштак самалёта. Але ж той зваліўся не над тайгою – на заселенай тэрыторыі. Усе збітыя авіямашыны насельніцтва разбірала на алюміній. Пасля вызвалення БССР не адбылося афіцыйнага расследавання справы, не надрукавалі паведамлення ў газетах. Заўважце: Варанянскаму гібель у палёце не перашкодзіла займець у Мінску вуліцу. І толькі Кеймах аказаўся ў ролі «невідзімкі», якую адмаўляюцца прызнаваць і ўпамінаць у публічнай прасторы.

Жанчын на Лубянцы таксама дапытвалі, але пачулі не тыя адказы, якія хацелі пачуць. Осіпава настойвала на тым, што трымала сувязь з атрадам «Дзімы». Мазанік распавяла пра падрабязнасці закладкі міны. Было што сказаць і Траян. Зоркі Герояў па распараджэнні Сталіна раздалі тром «дзяўчатам». Па ордэне Леніна атрымалі М.Фёдараў і В.Шчуцкая, маёр НКУС І.Залатар і Г.Фінская са спецгрупы «Бура». (Я дапускаю, што ўсе яны, уключна з Траян, заслугоўвалі высокіх узнагарод, толькі не з нагоды гэтай аперацыі.) Ордэны Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў атрымал дзевяць (!) вайсковых чыноў, якіх архівіст А.Валахановіч называў «тылавымі пацукамі». З іх большасць – афіцэры з ведамства дзяржбяспекі. У апошні момант згадалі «птушынае прозвішча» Дразда. Адзначаны высокай узнагародай не сам падпольшчык (на той час пакараны смерцю), а яго малодшая дачка Яніна – адзіная, хто выжыў з сям'і. І, вядома ж, начыста «забылі» камандзіра, які быў рухавіком і пачынальнікам справы. Няма сумненняў: Давід Кеймах стаў ахвярай міжведамаснай канкурэнцыі. Афіцэр належаў да армейскай разведкі і пасмеў абскакаць «Самога»!

Каб канчаткова расквітацца з канкурэнтам, Цанава і цэнзары выкраслілі яго імя з партызанскіх даведнікаў і ваенных энцыклапедый. А пазнейшыя рэдактары, згодна з прынцыпам «каб чаго не выйшла», прыбралі разам з ім і Лагойскі раён, дзе атрад дзейнічаў.

Толькі БелСЭ напісала праўду – хто выканаў загад генералісімуса і расквітаўся са стаўленікам Гітлера. Расійскі гісторык У.Лота лічыць прычынай ігнаравання Дзімы «недостаточно ясные в то время обстоятельства его гибели» і заклікае перагледзець ацэнку яго партызанскай дзейнасці. Даўно пара! Тым болей што на падобныя катастрофы існуе тэрмін даўнасці.

Загадка чацвёртая

За што Надзея Траян атрымала Зорку Героя?

Мікалай Хахлоў, чыё імя фігуруе ў сучасных псеўдагістарычных тэлефільмах, вярбоўку Мазанік прыпісвае сабе. Вядома, што ён круціўся ля яе дома і сустракаўся, але не здолеў увайсці ў кантакт. (Што не перашкодзіла яму атрымаць на грудзі ордэн Леніна.) Не ўдалося падступіцца да асцярожнай работніцы асабняка і Надзеі Траян з атрада «Бура» брыгады «Дзядзі Колі». Узнікае законнае пытанне: за што тады ёй далі званне Героя Савецкага Саюза? Так, яна імкнулася выканаць адказнае заданне, нават пабралася фіктыўным шлюбам, каб застацца ў Мінску. Аднак ці можна няўдалую спробу прыраўняць да рэальнага выніку? Непасрэдныя выканаўцы рызыкавалі жыццямі. Осіпава ўласнаручна праносіла англійскую «цацку» праз нямецкія пасты, Мазанік прымацоўвала міну ў спальні, куды не мела доступу.

Удзельнік вайны пісьменнік Мікалай Дуброўскі у кнізе «Бессмертие подвига» («Беларусь», 2004) пераказвае словы Алены пры апошняй іх сустрэчы ў 1995 годзе: «Надя на меня напирала, требовала от меня немедленно уничтожить Кубе. Её напористость меня насторожила и вызвала сомнение – не подставное ли она лицо. Ведь речь шла о моей жизни, о жизни моей сестры Валентины и её детей». Траян дапусціла промах: прапаноўвала пакаёўцы вялікую суму нямецкіх марак, чым, па сутнасці, і адпужнула.

Я не адразу разабралася, хто прысуседзіў Траян да асноўнай кампаніі і завёз яе на лясны аэрадром для адпраўкі ў Маскву. За спінай дзяўчыны маячыў Іван Залатар, намеснік камбрыга П.Лапаціна, і тое ведамства, якое трымала ў страху 1/6 частку сушы. Гісторык В.П.Гарматны піша: «Прадстаўленне да ўзнагарод рыхтаваў НКГБ, які ўпісаў у спіс узнагароджаных «свайго» чалавека – Надзею Віктараўну Траян, хоць яе ўдзел у аперацыі перапыніўся на раннім этапе» («Военно-исторический журнал», 2009, №№6,7).

Сама Траян не пакінула ўспамінаў, тым не менш у папяровых і электронных крыніцах можна знайсці эпізоды, звязаныя з яе «паляваннем на гаўляйтара».

Шмат дзе пішуць, быццам Мазанік напярэдадні выбуху прызначыла Траян сустрэчу. У такое цяжка паверыць, бо: а) яна даўно перапыніла з падазронай незнаёмкай кантакты; б) рыхтавалася закладваць ужо атрыманую з атрада міну. І вось Надзея на дамскім веласіпедзе нібыта вязе на Тэатрштрасэ запасную міну ў каробцы ад торта. Пад'езды да цэнтра былі заблакіраваны, дзяўчына развярнулася і толькі ва Уруччы даведалася, што замах адбыўся. Гэтыя звесткі ўзяты з успамінаў малодшага сына гераіні Аляксея Карацеева, адкуль яны жыўцом перакачавалі ў публікацыі, кнігі і тэлефільмы.

